ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

НОВАЕ ВЫДАТНАЕ ДАСЯГНЕННЕ САВЕЦКАЙ КАСМАНАЎТЫКІ

**ЗЯМЛЯ ПРЫНЯЛА РАДЫЁПЕРАДАЧУ З ПАВЕРХНІ МАРСА**

**НА АРБІТАХ ВАКОЛ ДАЛЁКАЙ ПЛАНЕТЫ «МАРС-2» І «МАРС-3»**


# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 36 (831) ● Чацвер, 9 снежня 1971 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXV

У гэтыя дні ва універсітэце вядзецца наладка новай ЭВМ «Мінск-32».

**На здымку:** намеснік начальніка ЭВМ **Г. Г. Лябецкі** за настройкай машыны. Фота **Д. Чаховіча.**

## ГОСЦІ БДУ

На днях гасцямі універсітэта былі кіраўнікі камуністычных саюзаў моладзі лацінаамерыканскіх краін: Балівіі, Бразіліі, Чылі, Венесуэлы, Уругвая. На прыёме прысутнічалі прадстаўнікі рэктарата, работнікі ЦК ЛКСМБ, члены камітэта камсамола універсітэта. Прарэктар па навуковай рабоце Леанід Вікенцьевіч Валадзько расказаў гасцям аб 50-гадовым шляху універсітэта, аб падрыхтоўцы спецыялістаў у нашай вну. З роляй і значэннем камсамольскай арганізацыі ў жыцці універсітэта пазнаёміў сакратар камітэта камсамола БДУ Алег Слука.

Госці задавалі шмат пытанняў. Іх цікавілі вучэбныя праграмы, працаўладкаванне выпускнікоў, сістэма завочнага навучання, бюджэт універсітэта і многае іншае.

Яны наведалі бібліятэку, навуковы і студэнцкія чытальныя залы, юбілейную выстаўку і выстаўку падарункаў універсітэту, спартыўныя залы, пабывалі на лекцыі ў фізікаў.

Развітваючыся, прадстаўнік камуністычнай моладзі Балівіі падзякаваў ад імя дэлегацыі за цёплы прыём, сказаў, што ў іх краіне маладзёжныя арганізацыі таксама карыстаюцца вялікім уплывам сярод студэнцтва.

На ўспамін аб універсітэце госці павязуць на радзіму кнігі і сувеніры беларускіх сяброў.

**Прэс-цэнтр камітэта камсамола**

## ХУТКА НАВАСЕЛЛЕ?

ВЫСОКА ў неба ўзняліся паверхі будынка на вуліцы Кастрычніцкай. Хутка яго навасёламі будуць студэнты нашага універсітэта. Каб даведацца аб будучым наваселлі больш падрабязна, нашы карэспандэнты У. Скульбедаў і У. Капуза звярнуліся да прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы І. А. Ажыгіна з некалькімі пытаннямі.

**— Іван Афанасьевіч, калі ласка, некалькі слоў аб новым інтэрнаце.**

— Інтэрнат № 7 адпавядае ўсім патрабаванням сучаснасці. Пакоі разлічаны на 3-х чалавек. У кожнай жылой ячэйцы — душавая і санвузел. Да паслуг студэнтаў — класы для самастойных заняткаў на кожным паверсе і агульная актавая зала на 2-м паверсе. Інтэрнат стане для яго жыхароў другім домам.

**— Як вы ацэньваеце працу будаўнікоў?**

— Я далучаюся да выказванняў рэктара універсітэта акадэміка А. Н. Сеўчанкі, які на юбілейным пасяджэнні ў гонар 50-годдзя БДУ вынес падзяку будаўнікам трэста № 4 БУ-7 за добрую працу. Яны пастараліся, перагледзелі свае абавязацельствы і вырашылі здаць інтэрнат у эксплуатацыю раней тэрміну. Нельга сказаць у іх адрас дрэннага. Працавалі днём і ноччу. Асноўныя работы на аб'екце выконвала брыгада бетоншчыкаў-плітачнікаў камуніста П. А. Трушкова. І вось вынік: аб'ект закончан.

**— Чаму тады, на вашу думку, яшчэ няма магчымасці засяліць інтэрнат?**

— Ведаеце, у кожнай справе ёсць свае плюсы і мінусы. Так і тут. 15 лістапада камісія агледзела будынак і выявіла недахопы. Трэба падключыць вадаправод, каналізацыю, газазабеспячэнне і электрычнасць да гарадской сеткі. Маецца і шэраг дробных недаробак.

**— Якія меры прымаюцца для таго, каб аб'ект хутчэй быў уведзен у эксплуатацыю?**

Для паскарэння тэрмінаў універсітэт узяў шэраг работ на сябе. Студэнты робяць уборку тэрыторыі вакол інтэрната, наводзяць парадак у памяшканні. Пасля застанецца пакрыць лакам падлогу, расставіць мэблю і абсталяванне.

Думаецца, што і будаўнікі трэста № 4 зробяць усё магчымае, каб як мага хутчэй здаць аб'ект.

**— Калі можна чакаць наваселля?**

Усё залежыць ад таго, што скажа дзяржаўная камісія. Можна меркаваць, што да 10 снежня агляд будзе поўнасцю закончан. Тады і вырашыцца пытанне аб засяленні.

**У НАВУКОВЫМ ПОШУКУ.**

## ПРОБА НА СТАЛАСЦЬ

Больш як 90 працэнтаў студэнтаў гістфака працуе ў навуковых гуртках, якіх на факультэце 15: гісторыі КПСС, гісторыі БССР, эстэтыкі, этыкі, псіхалогіі, логікі і іншыя. Дзейнічаюць яны на ўсіх кафедрах. Каб не распыляцца, студэнты ўжо на першым курсе выбіраюць тэмы, над якімі працуюць увесь час навучання ва універсітэце.

Маладзёжны рух, гісторыя Вялікай Айчыннай вайны, праблемы сацыялогіі, гістарычныя этапы развіцця СССР і БССР—гэта толькі некалькі тых праблем, якія цікавяць студэнтаў.

Самыя здольныя працягваюць сваю працу і пасля заканчэння універсітэта. Анатоль Тозік, напрыклад, стаў членам СНТ адразу ж пасля паступлення ва універсітэт. Цяпер ён у аспірантуры і працуе па сваёй тэме на кафедры гісторыі КПСС. І такіх аспірантаў на факультэце нямала.

Навуковыя працы студэнтаў гістарычнага факультэта неаднойчы вызначаліся на конкурсах, заваёўвалі прызавыя месцы. У 1970 годзе на Усесаюзным аглядзе работы Селязнёвай, Шынкара і Віннікавай атрымалі дыплом I ступені, работы Руновіча, Грыгарчук, Байчарава—II ступені і тры работы—дыплом III ступені.

**В. ЛАПЦІК,**
студэнт.

**СА СВЯТАМ!**

**10 снежня — Дзень незалежнасці Рэспублікі Танзаніі. Савет дружбы сардэчна віншуе танзанійскіх студэнтаў, якія вучацца ў БДУ імя У. І. Леніна, з вялікім нацыянальным святам.**

**Савет дружбы БДУ.**

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА

*КАМСАМОЛЬСКІХ СХОДАЎ ГРУП, ЯКАЯ РЭКАМЕНДУЕЦЦА КАМІТЭТАМ КАМСАМОЛА БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА НА 1971—1972 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД*

Задачы камсамольскай арганізацыі ў святле рашэнняў Усесаюзнага злёту студэнтаў.

Вынікі I этапу Ленінскага заліку «Рашэнні XXIV з'езда КПСС — у жыццё».

Мерапрыемствы групы па дастойнай сустрэчы 50-годдзя ўтварэння СССР.

Ваенна-патрыятычнае выхаванне — важная частка ідэйна-палітычнага выхавання моладзі.

Камсамольскай арганізацыі БДУ імя У. І. Леніна — 50 год.

Аб выкананні статутных абавязкаў камсамольцамі групы.

Аб павышэнні ўзроўню грамадска-палітычнай актыўнасці студэнта-камсамольца.

Месца студэнта-камсамольца ў правядзенні палітыка-масавай работы сярод насельніцтва.

Вынікі Ленінскага заліку «Рашэнні XXIV з'езда КПСС — у жыццё!».

Камсамол і грамадская работа.

Прынцып калектывізму і таварыскай узаемадапамогі ў вучобе.

Вучыцца на выдатна—доўг камсамольца.

Як ты рыхтуешся да практычных і семінарскіх заняткаў?

Вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі.

Падрыхтоўка да вытворчай практыкі.

Шлях да навукова-тэхнічнай творчасці.

Кожны камсамолец групы — член СНТ.

Камсамолец БДУ — узор высокай культуры і арганізаванасці.

У чалавеку ўсё павінна быць цудоўным.

Падтрыманне маральнага кодэксу будаўніка камунізму — абавязак кожнага камсамольца.

Аб змястоўным правядзенні вольнага часу студэнтаў.

Аб удзеле камсамольцаў у мастацкай самадзейнасці.

Спартыўнае жыццё групы.

Аб арганізацыі студэнцкіх будаўнічых атрадаў.

# ЛЯ ВЫТОКАЎ ЗАХАПЛЕННЯ

**Магчыма, гэты дзень для многіх, хто прысутнічаў тут, стане знамянальным у жыцці. Бо можа з яго пачнецца шлях у вялікую хімію, як некалькі гадоў назад гэта здарылася з Аляксандрам Верашчагіным і многімі іншымі студэнтамі хімфака, якія пажадалі ведаць больш, чым дае вучэбная праграма, і сталі членамі СНТ. І хто ведае, можа іх сцяжынка ў навуку пачыналася таксама вось з такой сустрэчы вучоных і выкладчыкаў са студэнтамі.**

**Першым бярэ слова загадчык кафедры радыяцыйнай хіміі, кандыдат хімічных навук Я. П. Пятрэнка. Ён расказвае аб напрамках навуковай дзейнасці, аб практычным выкарыстанні вынаходніцтваў навуковых супрацоўнікаў і студэнтаў.**

**Яго змяняе загадчык кафедры арганічнай хіміі прафесар І. Р. Цішчанка. Для таго, каб больш яскрава данесці да прысутных усе тыя праблемы, якія вырашае арганіка, Іван Рыгоравіч бярэ ў рукі мел і выводзіць ланцужкі хімічных злучэнняў. Цікава? Так. Бо відаць, з якім захапленнем сочаць за ім дзесяткі вачэй.**

**Затым выступае дэкан факультэта, загадчык кафедры хіміі высокамалекулярных злучэнняў Ф. М. Капуцкі. І зноў кола праблем, якія патрабуюць рашэння.**

**— Сучаснаму спецыялісту трэба не толькі многае ведаць, але і ўмець валодаць сваімі ведамі, каб яны не ляжалі мёртвым грузам. І каб, сутыкнуўшыся на прадпрыемстве з нечым новым, нядаўні студэнт не разгубіўся. А навыкі самастойнасці прыходзяць да тых, хто ўдзельнічае ў студэнцкім навуковым таварыстве,—пачынае гутарку загадчык кафедры неарганічнай хіміі В. В. Свірыдаў. Далей ён расказвае аб навуковай біяграфіі некалькіх сваіх выхаванцаў, колішніх членаў СНТ.**

**На гэтай сустрэчы студэнты праслухалі таксама выступленні прадстаўнікоў кафедр аналітычнай хіміі Л. М. Аўсянкі, нафтахіміі Г. Я. Кабо, фізічнай хіміі Н. Г. Рафальскага... З'явілася шмат зацікаўленых праблематыкай той ці іншай кафедры, тых, хто ў хуткім часе прыйдзе ў СНТ. Аб гэтым сведчаць шматлікія пытанні ўжо арганізацыйнага характару.**

**На кожным факультэце ёсць студэнцкія навуковыя таварыствы. Але ці ўсюды праводзяцца вось такія агітацыйныя сустрэчы? Вельмі патрэбныя сустрэчы.**

**Л. ДУК.**

# ВЫШЭЙШАЯ РАДАСЦЬ

Прыўзняты настрой, усмешкі на тварах. Гэтай раніцай студэнты БДУ пастроены ў лінію калон. Строй замірае, і ў наступіўшай урачыстай цішыні гучаць словы ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны С. А. Сінякова: «5-га снежня 1941 года пачаўся разгром нямецка-фашысцкіх захопнікаў пад Масквой. Гэты подзвіг будзе вечна жыць у памяці людзей...» Прамоўца гаворыць аб значэнні вялікай перамогі, гераізме савецкіх воінаў, жадае нашчадкам славы бацькоў выдатных поспехаў у вучобе, пералічвае прозвішчы лепшых студэнтаў: Е Баравіцкага, А. Чыруна, В. Чарткова, В. Апанасовіча, С. Куначева і многіх іншых. Адзначаюцца перадавыя групы фізікаў, матэматыкаў. З асаблівай цеплынёй ацэнена дзейнасць рацыяналізатараў В. Цераховіча, А. Шырочына, А. Жухавіцкага, якая дапамагае ўдасканальваць вучэбную базу ваеннай кафедры, садзейнічае лепшаму навучанню студэнтаў.

У кожным слове ветэрана адчуваецца гордасць за маладое пакаленне, за яго адданасць Камуністычнай партыі, Радзіме, за дапытлівы розум, жаданне авалодаць ведамі і быць дастойнымі пераемнікамі баявой і працоўнай славы старэйшага пакалення.

Выхаванню адданых будаўнікоў камунізму садзейнічаюць высокая арганізаванасць, прадуманасць навучальнага працэсу і выхаваўчых мерапрыемстваў, вялікі стаж і педагагічны вопыт выкладчыкаў ваеннай кафедры В. В. Лютава, І. В. Марчанкі, І. Т. Пракапенкі, С. А. Сінякова, В. І. Піменава і іншых. Пад іх кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле сістэматычна праводзяцца лекцыі, гутаркі, экскурсіі, сустрэчы. Цёпла ўспрыняты выступленні відных военачальнікаў: генерал-лейтэнантаў І. С. Жыгарава, С. С. Сергіенкі, палкоўнікаў П. І. Качаева, Е. А. Юрэвіча. Праслаўленыя воіны пераканаўча паказалі цяжкасці вайны, нянавісць да захопнікаў, масавы гераізм савецкіх людзей.

Аб вайне сённяшняе студэнцтва чытае з захапленнем, аналізуе кінафільмы, прагна ўслухоўваецца ў кожнае слова ветэранаў. Так было і на гэты раз: цёплая сустрэча ў падшэфнай воінскай часці з афіцэрам С. Е. Мірашнічэнкам, гарачыя прывітанні афіцэра Ю. М. Зільбермана, знаёмства з бытам воінаў. Цікавымі былі выступленні ветэранаў часці М. А. Кірычэкі і П. В. Карабкова, прайшоўшых дарогамі вайны ад сцен Сталінграда да логава фашысцкай Германіі — Берліна. Цяжкім быў шлях, яшчэ цяжэйшымі яго этапы: 1942 год—Сталінград, 1943 год—Курск, 1944—Мінск, Беласток, 1945—Берлін. І чым цяжэй было бацькам нашым, тым больш ганарымся мы імі, схіляемся перад іх мужнасцю і вернасцю воінскаму доўгу, з павагай глядзім на іх сівізну і радуемся нашай цудоўнай будучыні. П. В. Карабкоў закончыў сваё выступленне словамі Ш. Петэфі: «Я твой і целам і душой, краіна родная!»

Айчына! З ёй звязана жыццё шматмільённай сям'і савецкіх людзей. І сёння маладое пакаленне ўпэўнена ідзе дарогамі бацькоў. Юрый Міхайлавіч паведаміў, што выпускнікі БДУ лейтэнанты В. Г. Кузняцоў, Ю. Ю. Навоша, Л. В. Сільноў, В. В. Пытляк, М. А. Прымак і іншыя праходзяць службу ў часці і выдатна спраўляюцца са сваімі абавязкамі. Гэтым паведамленнем мы ганарымся ўсе: студэнты—поспехамі сваіх старэйшых таварышаў, выкладчыкі—усведамленнем, што падрыхтавана дастойная змена.

— Многа цудоўных людзей, выдатных спецыялістаў, вучоных працавала з намі,—сказаў выпускнік БДУ, лейтэнант С. П. Галецкі. — І я рад, што служу ў Савецкай Арміі. Адчуваю паўсядзённыя клопаты сваіх камандзіраў і ўвагу старэйшых таварышаў. Набытыя веды садзейнічаюць поспехам у пачэснай справе служэння Радзіме.

— Мая Айчына, каго любіць, як не цябе!—заявіў у адказным слове выдатнік, студэнт С. Кулёў.

Бясспрэчна, пасля такой сустрэчы кожны студэнт бярэ з сабой цяпло чалавечых сэрцаў, усведамленне высокай адказнасці перад Радзімай, якая абавязвае сама-аддана жыць, працаваць і вучыцца

**А. КАПУЦКІ.**



**Сустрэча з ветэранамі ў музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.**
Фота **Д. Чаховіча.**

У ГРУПАХ І НА КУРСАХ

## СТУПЕНЬКА РОСТУ

Камсамольскі сход закончыўся. Юнакі і дзяўчаты, абмеркаваўшы толькі што прынятыя планы, выходзілі з аўдыторыі. Камсорг групы Рая Лукашэвіч яшчэ раз прагледзела пункты мерапрыемстваў і запытала ў сакратара камітэта камсамола факультэта Віталія Балашчанкі:

— Здаецца, нічога не ўпусцілі?..

Чацвёртая група IV курса матфака па праву лічыцца адной з лепшых на факультэце. Ініцыятыўныя, працавітыя тут юнакі і дзяўчаты. Ім хочацца як мага больш зрабіць, як мага больш ведаць. І не дзіўна, што нават праграма самага цяжкага, як лічаць, чацвёртага курса, для іх не страшная. Аб гэтым яскрава сведчаць поспехі. Гордасцю групы з'яўляецца ленінскі стыпендыят, удзельнік Усесаюзнага злёту студэнтаў, сакратар камітэта камсамола факультэта Віталь Балашчанка, выдатнікі вучобы Аляксандр Марцанкоўскі, Ларыса Бярозкіна, Наташа Уліцёнак, Васіль Бабіч і іншыя.

Многія чацвёртакурснікі з іншых груп часам здзіўляюцца, у чым сакрэт, што ў чацвёртай групе сталі гаспадарамі толькі добрыя і выдатныя адзнакі? Сакрэт тут невялікі: калі ў каго-небудзь не ладзіцца з вучобай, яму прыйдуць на дапамогу, падкажуць і дапаражуць, а тых, хто не хоча вучыцца,— прымусяць.

Яшчэ адзін сакрэт заключаецца ў тым, што большасць студэнтаў займаецца у студэнцкім навуковым гуртку. Калектыўная работа «Плоскасць Лабачэўскага», якую напісалі студэнты гэтай групы, атрымала высокую ацэнку.

У кожнага студэнта групы ёсць і грамадскія даручэнні. Гэта дысцыплінуе, прымушае сур'ёзна адносіцца да кожнай справы.

**І. СЦЯПУРА.**

## ТЫ Ў АДКАЗЕ ЗА ГРУПУ

Хутка будуць падведзены вынікі конкурсу на лепшую студэнцкую групу ва універсітэце. Пераможцаў чакае паездка па цудоўных мясцінах нашай краіны, авеяных баявой і працоўнай славай.

Студэнцкі калектыў факультэта прыкладной матэматыкі аднадушна вылучыў для ўдзелу ў студэнцкім конкурсе чацвёртую групу IV курса. Ваганняў не было, таму што тут і актывістаў больш, і найбольш высокая адзнака апошняй экзаменацыйнай сесіі — 4,5 бала.

Камсорг групы Таня Калюжная з цеплынёй расказвае аб сваіх аднакурсніках:

— Уцягваць у грамадскае жыццё факультэта нікога не даводзілася. Камсамольцы ахвотна выконваюць пастаянныя і часовыя даручэнні. Аляксей Азараў — член камітэта камсамола універсітэта. Міша Фядзеня — намеснік сакратара камітэта камсамола факультэта.

Камсамольцы групы — ініцыятары правядзення кансультацый для першакурснікаў. Яны змястоўна расказваюць сваім малодшым сябрам аб усім, што тых цікавіць. Пытанняў жа у першакурснікаў звычайна шмат, бо факультэт наш малады і вельмі важны для народнай гаспадаркі.

Большасць камсамольцаў групы — актыўныя члены студэнцкага навуковага таварыства.

Ёсць у нас свае спартсмены. Алег Саланенка, Генадзь Хацкевіч, Аляксей Лютаў захапляюцца футболам. Яны уваходзяць у склад зборнай каманды факультэта.

Часта можна бачыць хлопцаў і дзяўчат з групы сярод факультэцкіх агітбрыгадаўцаў, якія карыстаюцца вялікай павагай і папулярнасцю ў Валожынскім раёне.

**А. СІНЬКЕВІЧ.**

# АСНОВА ДОБРЫХ ВЕДАЎ

Набліжаецца сесія. Гэта відаць па ўсім: больш заклапочанымі сталі студэнты, перапоўнены чытальныя залы. У некаторых групах ужо здаюць залікі. Напружана праходзяць практычныя заняткі. Аб ролі апошніх гаварыць не прыходзіцца. Тут, як у прымаўцы: цяжка ў вучэнні— лёгка ў баі: на экзамене. Толькі што закончыліся практычныя заняткі ў адной з груп геафака.

Я папрасіла выкладчыцу Веру Васільеўну Шчаглову расказаць, як прайшлі сённяшнія заняткі.

— Сёння займалася першая група III курса фізгеографаў. Тэма: пабудова геалагічнага профілю праз заходнюю палову рускай платформы па даных буравых шчылін. Я лічу, што заняткі прайшлі нядрэнна. Перш чым гаварыць аб актыўнасці, я раскажу аб спецыфіцы нашай работы. Мы не праводзім семінараў. Студэнты працуюць пісьмова: вычэрчваюць профілі. За некалькі дзён кожны атрымлівае надрукаванае заданне, разбірае яго дома. У час заняткаў выклікаю некаторых да геалагічнай і тэктанічнай карт, астатнія працягваюць працаваць. Адказваюць заўсёды добра, ахвотна.

**— Часта бываюць прапускі?**

— Сёння многія не прысутнічалі. А гэта ўжо «ЧП», прычыну якога мы абавязкова высветлім. Наогул, злосных прагульшчыкаў у нас мала. Я думаю, гэта абумоўлена тым, што курс вялікі: 50 лекцыйных і 20 практычных гадзін. У зімовую сесію студэнты здаюць залік, на падрыхтоўку да якога час не прадугледжваецца. Значыць, трэба шмат рабіць на практычных. Аснова добрых ведаў —карта. Нам даводзіцца вывучаць яе тут, у аўдыторыі. Студэнты разумеюць: прапусціш заняткі— не засвоіш пэўную тэму. Стала правілам: той, хто рэгулярна наведвае практычныя—добра адказвае на заліку.

**Л. ДРУЗЕВА.**

Практычныя заняткі па метэаралогіі са студэнтамі-географамі праводзіць асістэнт С. С. Коўшар.

Фота **Д. Чаховіча.**



## ЦІКАВАЯ ПАЕЗДКА

*Група студэнтаў біялагічнага факультэта, сярод якіх выдатнікі вучобы, камсамольскія актывісты Валодзя Бяляўскі, Святлана Бабіч, Вольга Нясюк, Слава Радзюк, Галя Парахневіч і іншыя, наведалі горад-герой Брэст. Экскурсанты агледзелі велічны мемарыяльны комплекс, пабывалі ў музеі А. В. Суворава ў Кобрыне, у Белавежскай пушчы.*

*Л. МАРОЗ.*

# 150 гадоў з дня нараджэння М. А. Някрасава

# ПАЭТ ПОМСТЫ І СМУТКУ

Можна з упэўненасцю сказаць, што пад уплывам В. Р. Бялінскага творчы шлях М. А. Някрасава вызначыўся як шлях паэта - рэаліста, паэта-трыбуна, а к канцу 1840-х гадоў ён стаў самым славутым паэтам на Русі, паэтам - дэмакратам, паэтам - рэвалюцыянерам, абаронцам шматпакутнага рускага народа.

У сваю чаргу В. Р. Бялінскі ў пісьмах і ў рэцэнзіі на «Петербургский сборник» (1846 г.), складальнікам і адным з аўтараў якога быў М. А. Някрасаў, назаве вершы паэта цікавымі, у якіх «шмат разумнага, дзельнага і сучаснага». Але ўсё гэта адбудзецца крыху пазней. А тады, пасля адмоўнага водзыву В. Р. Бялінскага на зборнік «Мары і гукі» М. А. Някрасаў выражшыў больш не пісаць вершаў і поўнасцю прысвяціць сваё жыццё журналісцкай працы. Цяжкае матэрыяльнае становішча прымушала працаваць дзень і ноч. Толькі на пачатку 1840-х гадоў з-пад яго пяра паяўляюцца рэцэнзіі на розныя кнігі, дзесяткі артыкулаў, фельетонаў, пародый, вадэвіляў і празаічных твораў.

А як жа з вершамі? Вершы пісаў таксама. Толькі цяпер яны былі іншага кірунку. Калі ў творах «Паэзія», «Два імгненні» (зборнік «Мары і гукі») ён пісаў, што паэзія — «гордая царыца», а паэт — «свабодны, як арол, магутны, нібы цар», то цяпер нараджалася другое, і гэта другое ішло з народных глыбінь. Нараджалася «муза помсты і смутку», муза — абаронца заняволеных і прыгнечаных. У 1848 годзе ён складае наступныя радкі:

**Учора ў шэсць, пагодным днём,**
**Зайшоў я на Сянную;**
**Там люта білі бізуном**
**Сялянку маладую.**
**І хоць бы крык з грудзей адзін,**
**Бізун сячэ, іграе...**
**І Музе я сказаў: «Глядзі!**
**Сястру тваю караюць!».**
**(Пер. М. Лужаніна).**

Шчырыя гутаркі з В. Р. Бялінскім, яго шматлікія артыкулы, якія, безумоўна, чытаў паэт, пільная ўвага да жыцця абяздоленых — усё гэта спрыяла станаўленню рэвалюцыйна-дэмакратычных поглядаў М. А. Някрасава ўвогуле і яго поглядаў на ролю і задачы паэзіі ў прыватнасці. Потым ён выкажа сваё літаратурнае крэда ў такіх вершах, як «Муза», «Заўжды шчаслівы той паэт...», «Свята жыцця — маладосці гады», «Змоўкні, Муза...», ледзь-ледзь не кажучы: ты самая нікчэмнасць!

І ўсё-такі якім жа павінен быць сапраўдны паэт? Гэта непакоіла М. А. Някрасава. Успаміналіся гарачыя размовы з В. Р. Бялінскім... Цяпер з М. А. Някрасавым у часопісе «Современник» працаваў М. Р. Чарнышэўскі, які ў сваёй дзейнасці працягваў справу В. Р. Бялінскага...

Роўнымі ланцужкамі на паперу клаліся словы дэкларацыі новай грамадзянскай паэзіі:

**Ідзі ў агонь за гонар краю,**
**За веліч мэты, за любоў...**
**Ідзі і смерць самаахвярна**
**Прымі: не згіне справа марна,**
**Калі пад ёй струменіць кроў!..**
**Грамадзянінам будзь! І ў вершах**
**Для шчасця ўсіх людзей жыві,**
**Свой геній прысвяці найперш ты**
**Пачуццю братняе любві.**
**(Пер. Н. Гілевіча).**

Паэт - грамадзянін, паэт - змагар! Паэзія — актыўная ўдзельніца барацьбы за народнае шчасце! Паэту могуць зрабіць папрок: маўляў, гэта толькі словы... Што ж — ён творам «Паэт і грамадзянін» адкрые свой зборнік. Гэта — нібы ўступ. Іншыя вершы яшчэ больш падмацуюць гэтую думку.

Меркавалася: за астатнія месяцы 1855 года ён сёе-тое дапрацуе, і да новага (1856) года кніга выйдзе з друку. Атрымалася інакш — зборнік «Вершы М. Някрасава» паступіў у продаж толькі ў кастрычніку 1856 года: цяжка было прабіцца праз цэнзурныя бар'еры. Аб зборніку загаварыла ўся Расія. М. Р. Чарнышэўскі 5 лістапада 1856 года паведамляў паэту (М. А. Някрасаў у той час знаходзіўся на лячэнні за мяжой): «Захапленне ўсеагульнае. Наўрад ці першыя паэмы Пушкіна, наўрад ці «Рэвізор» і «Мёртвыя душы» мелі такі поспех...»

Пройдуць гады... Будуць напісаны новыя творы, у прыватнасці такія паэмы, як «Карабейнікі», «Мароз, Чырвоны нос», «Рускія жанчыны», і нарэшце з'явіцца ў друку ўрыўкі з шэдэўра сусветнай паэзіі — твора «Каму на Русі жыць добра»; шэсць разоў будзе перавыдан зборнік вершаў 1856 года (вядома, расшыраны, перапрацаваны), але значэнне першага выдання цяжка пераацаніць. Зборнік вершаў паэта 1856 года — з'ява выключная: яшчэ ніхто да яго — М. А. Някрасава — не пісаў так шчыра, з такою любоўю аб народзе і з такім гневам аб яго прыгнятальніках.

І яшчэ: гэты зборнік паклаў пачатак новаму рэчышчу ў рускай паэзіі — някрасаўскаму, якое часам называюць рэвалюцыйным, грамадзянскім, народным.

У чым сутнасць някрасаўскай паэзіі? Перш за ўсё ў тым, што паэт упершыню ў гісторыі рускай літаратуры з выключнай мастацкай сілай перадаў настрой, пачуцці народа і — самае галоўнае! — вачыма працоўных людзей ён зірнуў на з'явы рускай рэчаіснасці. Адным словам, думы народа, яго імкненні сталі думамі і імкненнямі паэта. Адсюль у яго творах — народная гаворка, канкрэтнасць вобразаў, разнастайная інтанацыя. Больш таго, М. А. Някрасаў разумеў: вытокі ўсяго таго, што прыносіць людзям гора, няшчасце, трэба шукаць у існуючым сацыяльным ладзе тагачаснай Расіі. Таму амаль кожны твор паэта мае палітычную афарбоўку з выкрывальнымі адценнямі, а ў некаторых вершах і паэмах гнеўнае напружанне настолькі высокае, што іх можна назваць сапраўднымі памфлетамі. Гэтая якасць дала падставу У. І. Леніну, які вельмі высока цаніў паэтычную спадчыну і палітычную дзейнасць паэта, сказаць:

«Яшчэ Някрасаў і Салтыкоў вучылі рускае грамадства распазнаваць пад прыгладжаным і напамаджаным знешнім выглядам адукаванасці прыгонніка-пана яго драпежніцкія інтарэсы, вучылі ненавідзець крывадушнасць і бяздушнасць падобных тыпаў...»

І рускія, і ўкраінцы, і беларусы, і казахі, і людзі іншых нацыянальнасцей нашай краіны з вялікай павагай шануюць памяць М. А. Някрасава.

Мацнее саюз паэта з пакаленнямі. Творы яго чытаюць і перачытваюць на сваіх родных мовах мільёны людзей, а многія выдатныя паэты нашага часу — Д. Бедны, Ул. Маякоўскі, Якуб Колас, Янка Купала, А. Твардоўскі, М. Ісакоўскі, М. Танк, А. Куляшоў, П. Броўка — вучні і прадаўжальнікі някрасаўскіх традыцый.

**П. ТКАЧОЎ,**
**дацэнт.**



## ДА ЮБІЛЕЮ

**Шырока адзначаецца ва універсітэце 150-годдзе з дня нараджэння вялікага рускага паэта М. А. Някрасава. Гэтай знамянальнай даце прысвячаюцца літаратурныя вечары, лекцыі, гутаркі.**

**У бібліятэцы галоўнага корпуса адкрылася прыгожа аформленая змястоўная выстаўка «Пясняр рускага народа».**

**На філалагічным факультэце выйшаў літаратурны дадатак да насценгазеты «Слова філолага», у якім расказваецца аб жыццёвым і творчым шляху пісьменніка, аб сіле ўздзеяння яго творчасці. Тут жа змешчаны пытанні літаратурнай віктарыны.**

*Нядаўна ў серыі «Паэзія народаў СССР» выдавецтва «Беларусь» выпусціла ў перакладзе на беларускую мову зборнік лірыкі М. А. Някрасава.*

*Ніжэй друкуюцца вершы з гэтай кніжкі.*

## РУСКАМУ ПІСЬМЕННІКУ

Натоўпу дагаджаць—жаданне
Ў сваёй душы ты не насі;
Куды вышэйшае прызванне
Ёсць у пісьменніка Русі.

Не ўгоднік соладка-ліслівы
Карысны ёй! Прыйшла пара!
Ёй трэба працаўнік руплівы
На глебе Думкі і Дабра.

Служы не вокамгненнай славе,—
Для шчасця бліжняга жыві,
Свой геній прысвяці ты справе
Усеабдымнае Любві.

Калі на здольнасці багаты,
Не выстаўляй дарэмна іх.
Заззяюць самі, як брыльянты,
Іх промні ў творах у тваіх.

Мажліва й слабаю рукою
Найцвёрды камень раздрабіць,
Зірні: з-пад молата ляціць
Агонь іскрысты сам сабою.
**(Пер. Ул. ШАХАЎЦА).**

## НЯЗЖАТАЯ ПАЛОСКА

Позняя восень, гракі паляцелі,
Лес агаліўся, палі апусцелі,

Толькі не зжата палоска адна,
Сумную думу наводзіць яна.

Шэпчуць, здаецца, ў суладдзі калоссі:
— Сумна нам слухаць гул сіверу ўвосень,

Сумна галовы да долу схіляць,
Зерні багатыя ў пыле купаць!

Нас, што ні ноч, нішчаць птушкі, што ў вырай
Рушаць бясконца блакітнаю шырай,

Заяц нас топча і бура нас б'е.
Дзе ж наш араты? Што ў крыўду дае?

Ці мы ўрадзіліся горш, чым другія?
Ці красавалі не дужа, буйныя?

Не, мы не горш ад інакшых,— даўно
Зерні даспелі — усе, як адно.

Не для таго ж і араў ён і сеяў,
Каб нас тут вецер асенні развеяў?

Ніве адказвае восень сама:
— Моцы ў аратага болей няма.

Знаў, для чаго і скародзіў і сеяў
Ды не па сілах ён працу усцеяў.

Кепска з гаротным — не есць і не п'е
Скрухай зламаны, на свет не ўстае.

Рукі, што гэтае поле ўздымалі,
Высахлі ў трэску, як мёртвыя сталі,

Вочы патухлі і голас прапаў,
Што невясёлую песню спяваў,

Як, на саху налягаючы, колісь
Крочыў араты ў задуме па полі.
**(Пер. К. КІРЭЕНКІ).**

# МАРАТ ШУКАЕ

*ЗДЫМАЕЦЦА НОВЫ ФІЛЬМ*

**На кінастудыі «Беларусьфільм» вядзецца работа над новай мастацкай стужкай «Зімародак» па сцэнарыю Юрыя Якаўлева. Адзін з эпізодаў кінафільма здымаўся ў хімічным корпусе нашага універсітэта.**

**Малады рэжысёр Вячаслаў Нікіфараў, вядомы гледачу як пастаноўшчык тэлевізійнага мастацкага фільма «Бераг прынцэсы Люські» і дакументальнага «Ад вашага ўласнага карэспандэнта», расказвае:**

**— Зімародак—гэта прыгожая птушка, якая гняздзіцца на берагах беларускіх лясных рачулак. Самай адметнай, калі можна так сказаць, рысай яе «характару» з'яўляецца вернасць родным мясцінам. У народзе называюць зімародкам таксама стары дуб, які не паспеў скінуць на зіму летняе ўбранне з лісця.**

**Гэтыя вобразы ў розных эпізодах будуць пераклікацца з галоўнай ідэяй нашага кінафільма. Назва ж яго пайшла ад імя аднаго з герояў, таму што «Зімародак» — гэта партызанская клічка юнака, які, як усе лічаць, загінуў пасля паспяховага правядзення адной вельмі рызыкоўнай аперацыі.**

**І вось ужо ў нашы дні дапытлівы хлопчык Марат паставіў сваёй мэтай абавязкова даведацца пра лёс і сапраўднае імя героя. На шляху пошуку ён сустракае многа цікавых людзей. Мы імкнемся паказаць на экране працэс адкрыцця маленькім чалавекам цэлага свету з яго гісторыяй і сучаснасцю. У самім характары юнага следапыта закладзена імкненне пазнаць як мага больш. Цікава, што не дарослыя падштурхоўваюць яго дапытлівасць, а ён сам заражае іх нястрымнай прагай пошуку.**

**У ролі Марата здымаецца адэскі школьнік Саша Кузьмін. Сяброў Марата па фільму іграюць сапраўдныя сябры Сашы Кузьміна мінчане Зоя Нарбекава і Міша Мустыгін.**

**Акрамя юных артыстаў, здымаюцца Аляксандр Хвыля, Глеб Стрыжэнаў, Уладзімір Самойлаў і іншыя.**

**Работу пачалі яшчэ ў ліпені. Натурныя здымкі праводзілі ў Гродзенскай вобласці і ў Літве.**

**Мяркуем да 50-годдзя з дня нараджэння піянерскай арганізацыі імя У. І. Леніна зрабіць юнаму гледачу свой падарунак.**

**В. ЯНОЎСКІ.**



*У час здымак у хімічным корпусе БДУ аднаго з эпізодаў новай мастацкай кінастужкі «Зімародак» па сцэнарыю Юрыя Якаўлева.*

*Злева герой карціны—Марат (Саша Кузьмін).*

*Фота аўтара.*

## Адпачываюць студэнты

**Штодзённа раніцай да галоўнага корпуса БДУ аўтобус падвозіць групу студэнтаў. Гэта тыя, хто папраўляе сваё здароўе ў студэнцкім прафілакторыі, які размясціўся ў маляўнічым кутку ля Мінскага мора. Тут для добрага адпачынку і лячэння ёсць усе ўмовы. З пачатку года ў прафілакторыі пабывала каля 700 студэнтаў універсітэта. Звыш 200 юнакоў і дзяўчат набраліся сіл у дамах адпачынку і санаторыях.**

**І. ВІКТАРАЎ.**

# Спорт

## СПОРТКЛУБ ПРЫМАЕ СПРАВАЗДАЧУ

У павестцы чарговага пасяджэння спортклуба два пытанні: вынікі выступлення зборных каманд універсітэта па валейболу і спартыўна-масавая работа на факультэце журналістыкі.

Выступаючы па першаму пытанню трэнер валейбалістаў БДУ В. М. Кучынскі расказаў аб прайшоўшым занальным першынстве па валейболу сярод вну рэспублікі, на якім нашы мужчынская і жаночая каманды заваявалі права выступаць у фінале ў маі будучага года.

В. М. Кучынскі заўважыў, што ўзровень майстэрства каманд быў вельмі высокі. Нягледзячы на ўпартае супраціўленне моцных саперніка ў, нашы студэнты змаглі паспяхова закончыць спаборніцтвы. Усе хлопцы і дзяўчаты іралі зладжана, самаадданa, праявілі вялікую волю да перамогі.

Добрай рэпетыцыяй аказалася паездка ў Вільнюс, дзе нашы валейбалісты сустракаліся з мацнейшымі студэнцкімі валейбольнымі камандамі Літвы. Мужчынская зборная універсітэта была прадстаўлена на гэтых спаборніцтвах фізічным, гістарычным, матэматычным, біялагічным факультэтамі і факультэтам прыкладной матэматыкі. У дзяўчат ядро каманды саставілі студэнткі факультэта прыкладной матэматыкі — 6 чалавек, па аднаму дэлегіравалі матэматычны, філалагічны, юрыдычны і біялагічны факультэты.

У заключэнне В. М. Кучынскі сказаў:

— Хацелася б, каб валейбольная каманда БДУ, якая мае нядрэнныя традыцыі, заняла належнае ёй месца ў рэспубліцы.

Аб спартыўных справах журфака далажыў старшыня спортбюро А. Елісееў:

— У гэтым годзе журфак не можа пахваліцца спартыўнымі дасягненнямі. Галоўныя прычыны гэтага, бадай, у тым, што факультэт невялікі, пасіўнічаюць многія студэнты, затым адсутнасць трэніровачных залаў, дрэнна састаўлены расклад заняткаў секцый. Ды і ў секцыі трапіць не так проста, бо там займаюцца толькі разрадні кі, а астатнія застаюцца ў баку. Натуральна, рабятам не вельмі хочацца прымаць удзел у спаборніцтвах, загадзя ведаючы аб сваім паражэнні.

У садакладзе выступіў адказны за спартыўную работу на факультэце А. С. Саунін. Ён паведаміў, што цяпер састаў спартыўнага бюро факультэта больш працаздольны ў параўнанні з мінулагоднім, вядзецца падрыхтоўка да аглядуконкурсу, дзе факультэт разлічвае заняць высокае месца. Ён адзначыў вялікую падтрымку спартыўных мерапрыемстваў дэканатам і камітэтам камсамола.

**М. ХАРЫТОНАЎ.**

## *КУБАК У СТУДЭНТАЎ*

*Закончыліся спаборніцтвы на Кубак Мінска па цяжкай атлетыцы сярод юніёраў, у якіх прымалі ўдзел спартсмены заводскіх калектываў, а таксама вышэйшых навучальных устаноў горада. Першае месца ва ўпартай барацьбе са спартсменамі інстытута фізкультуры заваявалі асілкі нашага універсітэта.*

*Студэнт I курса юрыдычнага факультэта Міхаіл Жыцянёў перамог у паўсярэдняй вагавой катэгорыі, выканаўшы пры гэтым нарматыў кандыдата ў майстры спорту. Другім прызёрам стаў студэнт IV курса гістарычнага факультэта Віктар Фядосік, які выступаў у лёгкай вазе. Астатнія члены каманды таксама спаборнічалі ўдала. Усе яны прынеслі неабходныя заліковыя ачкі.*

*Рыхтавалі універсітэцкіх спартсменаў трэнеры В. Ф. Кавалёў і А. С. Саунін.*

*Паспяховае выступленне студэнтаў дазволіла камандзе «Буравесніка» заваяваць агульнае I месца і Кубак Мінска.*

*В. УЛАДЗІМІРАЎ.*

На здымку: **М. Жыцянёў.**



## ЦІКАВА ЎДЗЕЛЬНІКАМ І АМАТАРАМ

Спартыўнае бюро факультэта прыкладной матэматыкі падвяло вынікі класіфікацыйнага турніру па шашках, прысвечанага 50-годдзю нашага універсітэта. У ім прымала ўдзел 15 чалавек. Сярод іх адна дзяўчына — першакурсніца Ніна Сарокіна.

Састаў каманды вельмі моцны. Аб гэтым сведчыць высокі каэфіцыент турніру: 1,5. Сярод удзельнікаў — майстар спорту В. Беляеўскі, кандыдат у майстры Ч. Роліч, першаразраднікі.

У час турніру асабліва ўпартая барацьба назіралася на шашачных дошках экс-чэмпіёна БССР В. Беляеўскага і яго партнёраў. В. Беляеўскі правёў цікавы сеанс адначасовай гульні.

У выніку турніру першы разрад пацвердзілі Анатоль Глушцоў, Антон Эйсмант, Пётр Матусаў, Ігар Ярошын. Першы разрад прысуджан Пятру Герасімовічу.

Найбольшую колькасць ачкоў—дванаццаць з чатырнаццаці магчымых — набраў А. Глушцоў. Ён і заняў першае месца. Нядрэнна выступіла і Ніна Сарокіна, якая ўжо мае другі разрад. Яна заняла 8-е месца, атрымаўшы тры перамогі над сапернікамі-мужчынамі.

Класіфікацыйны турнір прынёс аматарам шашак сапраўднае задавальненне, бо былі ў ім добра праведзеныя партыі, прыгожыя камбінацыі, захапляючыя атакі.

**Т. СЕНЧЫК.**

## НА АГНЯВЫМ РУБЯЖЫ — ФІЗІКІ

Шырокай папулярнасцю карыстаецца на фізічным факультэце стралковы спорт. Камітэт ДТСААФ шмат робіць для таго, каб ён стаў больш масавым. «Добра страляць павінен кожны» — гэта адзін з асноўных прынцыпаў арганізацыі абаронна-масавай работы камітэта, які паспяхова праводзяць у жыццё грамадскія інструктары, студэнты Аляксандр Радзюк, Валерый Прыемка, Анатоль Васільцоў.

У секцыі, дзе яны вядуць заняткі па навучанню тэхніцы стральбы, займаецца звыш 200 студэнтаў і супрацоўнікаў факультэта. Добрая арганізацыя трэніровак, старанная, упартая праца інструктараў, любоў да стралковага спорту саміх спартсменаў — усё гэта прыносіць значныя вынікі. На факультэце падрыхтавана ўжо больш 40 стралкоў-разраднікаў.

Фізфак з'яўляецца асноўным «пастаўшчыком» стралкоў у зборную каманду універсітэта. 13 студэнтаў займаюцца зараз у яе трэнера Канстанціна Мікалаевіча Малахава. Большасць з іх прайшла пачатковую школу майстэрства ў грамадскага інструктара, студэнта II курса Пятра Цюрыкава.

— У тым, што тры спартсмены фізфака трывала замацаваліся ў асноўным саставе зборнай, — расказвае трэнер К. М. Малахаў, — заслуга менавіта гэтага студэнта. Сам Цюрыкаў з'яўляецца адным з лепшых стралкоў універсітэта. Свой вопыт і майстэрства ён старанна перадае таварышам па камандзе. У добрых стралкоў пад яго кіраўніцтвам выраслі Леанід Масанін, Юрый Мядзведзь, Галя Германенка.

Стралкі фізічнага факультэта ў гэтым годзе выступілі на ўсіх спаборніцтвах, якія праводзіў камітэт ДТСААФ універсітэта, асабліва паспяхова. Яны занялі агульнакаманднае першае месца на універсітэцкай спартакіядзе і не ўступілі сваё першынство на спаборніцтвах у гонар Дня Перамогі і 50-годдзя БДУ.

**У. БАРЫСЕНКА,**
**студэнт.**



Адзін з момантаў гульні па валейболу паміж групамі III курса журфака.

Фота В. РАКІЦКАГА.

## УСЁ ВЫРАШАЕ ВОЛЯ

У верасні гэтага года студэнт III курса аддзялення палітэканоміі гістарычнага факультэта Юрый Глыбоўскі атрымаў званне майстра спорту. Апроч таго, ён экс-рэкардсмен рэспублікі па скачках з шастом, выдатнік вучобы.

**— Юра, як пачынаўся твой шлях у вялікі спорт?**

— Гэта было ў 6-м класе. Мой старэйшы брат Анатоль займаўся скачкамі з шастом і паказваў нядрэнныя вынікі. Вось тады мне і захацелася заняцца спортам. З тых пор 6 гадоў трэніруюся ў заслужанага майстра спорту, экс-рэкардсмена Еўропы і СССР па скачках з шастом Уладзіміра Георгіевіча Булатава.

**— Калі ўпершыню прыйшоў да цябе поспех?**

— Першая перамога — самая дарагая для мяне. Яна не ўвянчалася ні лаўрамі, ні медалем, але менавіта з яе пачаліся мае поспехі ў спорце. У 13 гадоў я стаў удзельнічаць у юнацкіх спаборніцтвах. Рыхтаваўся да іх сур'ёзна і настойліва. І калі ў 16 год давёў асабісты рэкорд да 4 м 70 см. то ўпершыню адчуў, што змагу дабіцца лепшых вынікаў.

**— Ці прымаў ты ўдзел у міжнародных спаборніцтвах?**

— Так, упершыню ў жніўні 1969 года ў Сафіі, выступаючы за юнацкую зборную каманду СССР, я стаў бронзавым прызёрам, скокнуўшы на 4 м 40 см.

У 1970 годзе прадстаўляў юнацкую зборную краіны у спаборніцтвах сацыялістычных краін у Румыніі. Вынік быў лепшы, чым на спаборніцтвах у Сафіі — 4 м 70 см, заваяваў бронзавы медаль. І гэтым летам я зноў удзельнічаў у спаборніцтвах у Балгарыі.

**— Ці адчуваў калі-небудзь няўпэўненасць, расчараванне?**

— Некалькі год назад на вясенніх спаборніцтвах я атрымаў сур'ёзную траўму. Доўга ляжаў у бальніцы. Тады ўпершыню і з'явілася няўпэўненасць, але затым прыйшла мая галоўная перамога — перамога над самім сабой.

Трэніраваўся па асобай праграме, распрацаванай трэнерам. Паступова ўзнаўляліся сілы, вярталася ўпэўненасць. У адных з першых летніх спаборніцтваў узяў 4 м 65 см — усяго на 5 см ніжэй свайго асабістага рэкорду.

**— Каму больш за ўсё абавязан поспехамі ў спорце?**

— Усімі спартыўнымі поспехамі, перамогамі ў спаборніцтвах, тым, што змог скокнуць на 4 м 90 см пасля перанесенай траўмы, я абавязан, перш за ўсё, свайму трэнеру Уладзіміру Георгіевічу Булатаву. Многае даў мне універсітэт. На нашым факультэце добра пастаўлена спартыўная работа. Дэканат падтрымлівае спартыўныя мерапрыемствы.

**— Як табе ўдаецца выдатна вучыцца і паспяхова выступаць на спартыўнай арэне? Якія планы на будучае?**

— Спорт дапамагае быць не толькі фізічна моцным, але і добра вучыцца. Кожны дзень трэніруюся па 3 гадзіны. Галоўнае, я лічу, умець рацыянальна выкарыстоўваць свой час.

У будучым мару давесці асабісты рэкорд да 5 м—5 м 10 см.

**Гутарку вяла**
**Л. КУЗЬМІНА.**

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 15285. Заказ 1478.